дзяў ператварыліся ў легенды, яны жывуць да сённяшняга дня. Паводле адной з іх насельніцтва Скрыгалава схавалася ад татар у царкве, дзе ў гэты час знаходзіўся мітрапаліт Макарый. Ворагі патрабавалі ад мітрапаліта заклікаць насельніцтва пакарыцца, заплаціць даніну і даць праваднікоў, каб рухацца ў глыбіню беларускіх земляў. Гэта гарантавала б насельніцтву і гасцям з Вільні выратаванне. Высока падняўшы над галавой крыж, Макарый сказаў: «Святы крыж не дазваляе, каб ворагі веры праваслаўнай ішлі далей і знішчалі яе жыхароў. Далей дарогі няма...» Раз'юшаныя ворагі накінуліся на Макарыя, павялі яго да ракі, адсеклі галаву і на дошцы пусцілі ўніз па цячэнні Прыпяці: «Ты ехаў у Кіеў, туды мы цябе і адпраўляем!» Тым часам людзі разбегліся па навакольным лесе...

Паводле другога падання Макарый выйшаў наперад людзей і смела сказаў ворагу: «Хочаце праваслаўнай крыві, праклятыя, бярыце маю! Народ не чапайце... Бог і народ вечныя!»

Гавораць і так, што Макарый заклікаў насельніцтва не карміць татарскіх коней, каб ворагі не маглі ехаць далей, выклікаў гэтым гнеў качэўнікаў...

Ёсць і іншыя версіі, але сутнасць іх адна — мітрапаліт Кіеўскі і Усея Русі Макарый загінуў у Скрыгалаве, ратуючы яго жыхароў, увесь народ Беларусі ад знішчэння крымскімі татарамі, здзейсніў вялікі патрыятычны і маральны подзвіг.

Цела мітрапаліта перавезлі ў Кіеў і паклалі ў саборным храме св. Сафіі. Святыя мошчы Макарыя пакояцца цяпер ва Уладзімірскім кафедральным саборы Кіева.

*М. Капач*

## У складзе Расійскай імперыі

У першай палове XIX ст. Мазыр па-ранейшаму не адыгрываў значнай ролі ў эканамічным, палітычным і духоўным жыцці Мінскай губерні. Аднак вяртанне Мазыршчыны ў склад рускай дзяржавы паклала своеасаблівы адбітак на жыццё гэтага аддаленага, правінцыйнага краю. Згодна з распараджэннем генерал-пракурора сената князя А. Б. Куракіна ад 25 сакавіка 1798 г. Мінскай губернскай чарцёжнай да 1800 г. быў складзены атлас Мінскай губерні, дзе ўпершыню дадзена падрабязная характарыстыка Мазыра і яго мясцовасці.

У канцы XVIII—пачатку XIX стст. пад забудовамі горада было занята 52 дзесяціны. 8707 дзесяцін зямлі павета знаходзілася пад выганамі і ворывам. У горадзе меліся тры мураваныя і адзін драўляны манастыр, пяць драўляных праваслаўных цэркваў, тры мураваныя і адзін драўляны каталіцкі касцёл, дзве яўрэйскія і хрысціянскія народныя школы. Быў толькі адзін мураваны двор, астатнія — драўляныя, з іх 543 належалі хрысціянам, 84 — яўрэям, 38 — шляхце. Налічвалася 7 яўрэяў-купцоў, 841 мешчанін-хрысціянін і 160 яўрэяў-мяшчан, 128 шляхціцаў (мужчынскага роду).

Атлас 1800 г. вызначае маёмаснае становішча гараджан у залежнасці ад адносін да зямлі: на «купленных землях стояли 3 мещанские (обывательские) и 18 еврейских усадеб». 2 шляхецкія двары знаходзіліся ў юрысдыкцыі ксяндзоў-бернардзінцаў, 22 дамы мяшчан і 3 яўрэйскія дамы стаялі на царкоўных землях. Большасць жылых пабудоў, такім чынам, з'яўляліся спадчыннымі ўладаннямі. Эканамічная запіска да атласа паясняе, што ў склад горада ўваходзіла 260 двароў з 607 душамі мужчынскага і 646 душамі жаночага полу. Мяшчанам-хрысціянам належала 157 двароў (357 мужчын і 320 жанчын), яўрэям — 84 дамы (242 мужчыны

і 299 жанчын). У 19 сядзібах пражывалі 21 мужчына і 15 жанчын шляхты.

Каля горада ў засценках Салаўёўка, Барбароў, Кандуроўка, Цераноўка, Слабада, на хутарах Пранькі, Лапці, Целяпуны, Козенкі, Бабры, Матрункі, Булаўкі налічвалася 225 сялянскіх двароў (587 мужчын і 631 жанчына). У 15 дварах ваколіц Чарніцы і Людзін жылі 54 мужчыны і 58 жанчын шляхецкага саслоўя. Сяло Кімбараўка, вёскі Навікі і Юхноўка з 30 дварамі, 243 душамі сялян і 12 шляхціцамі належалі каталіцкаму касцёлу; Замаролкаўшчына (Ясная Гара) з 3 дварамі і 13 сялянамі абодвух полаў — ксяндзам-базіліянам. Мазырскі павет, найбольш буйны па тэрыторыі ў Беларусі, быў найменш населены, тут пражывала ўсяго 38 074 душы мужчынскага полу і 37 968 жаночага.

На працягу XIX ст. на Мазыршчыне было адносна спакойна. Адбушавалі найбольш значныя палітычныя і ваенныя падзеі папярэдніх стагоддзяў, і толькі водгукі іх далятaлі сюды, у глыбіню беларускага Палесся. Мазыр жыў, упершыню за многія стагоддзі, ціхім правінцыйным жыццём.

У час Айчыннай вайны 1812 г. горад застаўся ў баку ад галоўнага напрамку руху напалеонаўскіх войск. Паспяховыя дзеянні рэзервовай арміі пад камандаваннем генерала ад кавалерыі А. П. Тармосава ў пачатку вайны не дазволілі французам паглыбіцца на тэрыторыю краіны ў паўднёвым напрамку. У Беларусі яшчэ напярэдадні вайны пачалі ствараццa магазіны (інтэнданцкія склады) — у Мазыры, Дрысе, Дзісне, Мінску і іншых гарадах.

Яшчэ адной важнай гістарычнай падзеяй першай палавіны XIX ст. у Беларусі, рэха якой дакацілася да Мазыршчыны, было паўстанне 1830—1831 гг. Яно ўскалыхнула ўсю Польшчу і мела нацыянальна-вызваленчую мэту. Сваёй задачай паўстанцы ставілі пазбаўленне ад расійскага панавання і аднаўленне Рэчы Паспалітай у межах 1772 г.

Вясной 1831 г. паўстанне перакінулася на тэрыторыю Беларусі. Падпалкоўнік корпуса жандараў Рэбіндэр пісаў 10 мая 1831 г. шэфу корпуса жандараў графу А. Х. Бенкендорфу: «... дух и настроение в Минской губернии одинаковы, и все в целом местные помещики и шляхта, а в особенности католическое духовенство очень плохо относятся к правительству».

У Мінскай губерні паўстанне ахапіла спачатку заходнія і паўночна-заходнія паветы, паўднёвыя (да якіх належаў і Мазырскі) — толькі ў чэрвені 1831 г. Гэта тлумачылася тым, што ў Мазырскім, Рэчыцкім, Пінскім паветах у атрадах паўстанцаў было значна менш людзей польска-каталіцкага веравызнання. Акрамя гэтага, паўднёвыя паветы былі ізаляваны ад Літвы і Польшчы і, такім чынам, пазбаўлены знешняй падтрымкі. Паўстанне ў Беларусі ў сувязі з бяздзейнасцю Віленскага камітэта паўстанцаў (студзень — люты 1831 г.) ішло разрознена і бесперспектыўна.

Кіраваў паўстаннем на Мазыршчыне памешчык Фелікс Кяневіч. 6 чэрвеня ён з атрадам у некалькі дзесяткаў чалавек заняў на Валынскім тракце паштовыя станцыі ў Міхалках, Караліне (Ельску) і Кузьмічах, раззброіў ваенны атрад. 11 чэрвеня атрад Кяневіча паспрабаваў весці наступленне на Мазыр, але пасля кароткай і жорсткай сутычкі з урадавымі войскамі паўстанцы былі разбіты і мусілі адступіць у Міхалкі. Кіраўніцтва паўстанцаў трымала сувязь са шляхтай Рэчыцкага і Пінскага паветаў, а таксама Валыні. Меркавалася стварыць адзіныя органы ўлады на тэрыторыі Мазырскага, Рэчыцкага і Пінскага паветаў, што дало б магчымасць аб'яднаць значныя сілы ў барацьбе супраць «маскалёў». Мазырскае дваранства прапанавала ўзначаліць паўстанцаў трох аб'яднаных паветаў 77-гадоваму Каралю Прозару, памешчыку з Хойнікаў, абознаму (генерал-кватэрмайстру войска) Вялікага княства Літоўскага, колішняму ўдзельніку

паўстання Т. Касцюшкі. Ён павінен быў стаць на чале ваеннага атрада колькасцю каля тысячы чалавек. Да Караля Прозара звярнуліся з пісьмом, у якім быў заклік да дзеянняў. Ротмістр Крузе ў рапарце на імя мінскага губернатара пісаў 16 ліпеня 1834 г.: «Прозор собирается принять руководство над поветами Пинским, Речицким и Мозырским...» Аднак хойніцкі памешчык адмовіўся ад высокай пасады, спаслаўшыся на «слабость физических сил». Фелікс Кянevіч разам са сваімі аднадумцамі аб'язджаў Палессе, вербаваў шляхту і сялян у войска, абяцаў надзелы зямлі і зніжэнне аброку. Сяляне спачатку далучыліся да паўстанцаў, але хутка пераканаліся, што кіраўніцтва антыўрадавым рухам не ставіць сур'ёзна і канкрэтна пытанне аб адмене прыгоннага права і надзеле сялян зямлёй, яно больш кіруецца сваімі інтарэсамі. Апалчэнцы пры кожным зручным выпадку пакідалі атрады паўстанцаў, у войску заставаліся дваране і шляхта.

Фелікс Кяневіч наладзіў сувязь з камандай мазырскага гарнізона, якой камандаваў падпаручнік Артабаеўскі, з мэтай перацягнуць яе на свой бок. Аднак салдаты, па паходжанні рускія, не падаліся агітацыі і засталіся на баку ўрада. Вакол горада адбываліся частыя сутычкі паміж байцамі атрада Кяневіча і салдатамі гарнізона. У адным з такіх баёў у канцы чэрвеня паўстанцы былі разбіты, многія ўзяты ў палон. Частка іх схавалася ў навакольных лясах, некалькі дзесяткаў паўстанцаў на чале з Кяневічам адышлі ў вёску Мухаеды Рэчыцкага павета (цяпер вёска Кіраў Нараўлянскага р-на), дзе яны злучыліся з рэшткамі разбітых атрадаў паўстанцаў Рэчыцкага і Пінскага паветаў. 18 ліпеня аб'яднаны атрад паўстанцаў колькасцю да 200 чалавек пераправіўся цераз Прыпяць і наблізіўся да Мазыра. Рыхтавалася новая бітва, але на мяжы Мазырскага і Рэчыцкага паветаў з'явілася воінская каманда з Бабруйска пад кіраўніцтвам падпалкоўніка Тутамліна. У баі пад Мазыром паўстанцы пацярпелі жорсткае паражэнне, рэшткі іх рассеяліся. У канцы ліпеня 1831 г. паўстанне на Мазыршчыне было канчаткова задушана.

У адным з архіўных дакументаў, датаваных 3 верасня 1832 г., ёсць звесткі: «...по обольщению польского восстания Наполеона Новицкого он (Кеневич) нарушил верноподданническую присягу, присоединился с другими жителями Мозырского уезда (к восставшим), был избран их предводителем и по разбитии его войсками бежал в Варшаву, где избрали его представителем Минской губернии. По занятии сего города удалился в Галицию и, чувствуя, что всемилостивейшие указы к нему не относятся, прибегает к милости его императорского величества... По справке оказалось, что Феликс Кеневич по действиям его причислен по 2-му разряду государственных преступников, и вследствие того постановлено: всякое принадлежащее ему движимое и недвижимое имение подвергнуть секвестру».

Дом Фелікса Кяневіча, пабудаваны ў канцы XVIII ст., адзін з нямногіх мураваных будынкаў у Мазыры, быў канфіскаваны і перададзены пад трохкласнае дваранскае вучылішча, якое стала пазней мужчынскай гімназіяй (цяпер адзін з карпусоў санаторна-лясной школы).

Праз Мазыр у тыя гады праязджалі члены царскай сям'і. К. Шпакоўскі пісаў: «В более отдаленное время, когда не было железных дорог, ученики имели счастье видеть лиц императорской фамилии при проезде их через Мозырь, расположенный при так называемом Екатерининском тракте, связывающим Петербург с Киевом и Одессой. Например, в апреле 1828 г. учителям было объявлено: «Строжайше подтверждайте ученикам, чтобы они при случае встречи при проезде через Мозырь императорской фамилии соблюдали спокойствие, повиновение и почтение...»

В 10 часов утра 27 апреля того же года изволили проехать через город его Высочество Великий Князь Михаил Павлович, 30 апреля в 10 часов вечера изволили проехать его Императорское Величество Государь Император Николай Павлович со своей свитою, а 7 мая в 10 часов утра — ее Императорское Величество Государыня Императрица Александра Федоровна с дочерью Великой Княжною Марией Николаевной со свитою... В июне того же года через Мозырь проходили гвардейские полки, пехота и конница...» Для правінцыйнага гарадка той пары гэта былі значныя падзеі.

З Мінскам і Кіевам Мазыр злучалі сухапутныя шляхі, але ў Кіеў можна было дабрацца і па вадзе. Такім жа чынам ажыццяўлялася сувязь і з гарадамі

Прыбалтыкі і Польшчы. У Мазыры існавала прыстань (у раёне цяперашняй цэнтральнай плошчы). У раёне цяперашняй Прымаставой плошчы і ва ўрочышчы Кімбараўка дзейнічалі паромныя пераправы. Акрамя гэтага, уздоўж Прыпяці былі размешчаны 16 часовых прыстаняў, сярод іх Загорынская, Гурыноўская, Скрыгалаўская, Барбароўская, Балажэвіцкая, Касцюковіцкая, Кімбараўская і іншыя. Дзякуючы ім пашыраліся гандлёвыя сувязі горада. На кірмашах гандлявалі збожжам, бульбай, гарэлкай (гандаль прадуктамі вінаробства даваў асабліва вялікі прыбытак), шкіпінарам, лесам, жывёлай, вырабамі рамеснай вытворчасці.

Для перавозкі грузаў выкарыстоўвалі параходы (грузапад'ёмнасцю ад 7000 да 15 000 пудоў), байдакі (ад 8000 да 15 000), паўбайдакі (ад 5000 да 7000), берліны (ад 4000 да 7000), баркі (ад 4000 да 5000), паўбаркі (ад 2000 да 3600), дубы (ад 200 да 600), лодкі (ад 150 да 500 пудоў). Лес сплаўлялі вялізнымі плытамі. З пачатку XIX ст. пачалася пагрузка непасрэдна на мазырскай прыстані, дзе ў 1852 г. працавала 3527 чалавек, у 1854 г. — 8048.

У 1850 г. на Прыпяці з'явіўся першы параход «Вісла», магутнасць рухавіка якога складала 24 к. с. «Вісла» рабіла рэйсы паміж Пінскам і Крамянчугом, уладальнікам яе быў Уладзіслаў Пуслеўскі. У 50—60-я гады па Прыпяці плавала ўжо цэлая флатылія, пачаліся рэгулярныя рэйсы паміж гарадамі на берагах Прыпяці, Дняпра, Сожа, Бярэзіны, Піны: буксірныя параходы «Святаслаў» магутнасцю 100 к. с., «Матадор», «Капернік», «Надзея», «Піна», «Нёман», «Кумір», «Леў», «Вера», «Кіеў», «Фартуна» і іншыя, якія належалі купцам Левіну, Лур'е, Ліўшыцу, Разенталю, братам Сімярэнкам.

У пачатку 40-х гадоў XIX ст. былі наступныя цэны на асноўныя тавары: чвэрць жыта — ад 2 руб. да 3 руб. 10 кап., куль аржаной мукі — ад 2 руб. 50 кап. да 2 руб. 60 кап., чвэрць круп — ад 4 руб. да 4 руб. 10 кап., чвэрць аўса — ад 1 руб. 40 кап. да 1 руб. 75 кап., пуд сена — ад 12 да 15 кап., 6 вёдзер гарэлкі — 4 руб. 50 кап. серабром, пуд сала — 3 руб. 35 кап., пуд мёду — 2 руб. 30 кап. (Сярэдні месячны заробак рабочага на той час складаў прыкладна 6—7 руб.)

У 1825 г. у Мазыры налічвалася крыху больш як 2900 жыхароў, 3 мураваныя дамы, 530 драўляных, 5 цэркваў, 2 манастыры, 22 лаўкі, карчма, 26 піцейных дамоў. Але заводаў і фабрык не было. У данясенні мазырскай гарадской паліцыі мінскаму губернатару А. Ф. Дрэбушу 29 чэрвеня 1834 г. паведамлялася: «По городу Мозырю, так же равно по хуторам и селам оного ... фабрик и заводов никаких не имеется». Дробныя прамысловыя прадпрыемствы меліся ў павеце: «В Мозырском уезде находятся следующие заводы, както: 1-е поташные, 2-е — железные — 8 штук, 3-е — смоляные, 4-е — дегтевые у всякого помещика да и по несколько у одного, имеющие печи, в коих из сосновой лучины смола, а из бересты деготь выделывается...» Ёсць упамінанне аб тытунёвай фабрыцы — першай прамысловай вытворчасці ў Мазыры, якая адкрывалася ў 1860 г. На ёй працавала пяць чалавек. Праз некалькі гадоў фабрыка была закрыта, не вытрымаўшы канкурэнцыі з больш буйнымі прадпрыемствамі галіны.

К 60-м гадам тэрыторыя Мазырскага павета павялічылася. Яго плошча склала 14 095 кв. вёрст і была амаль роўнай агульнай плошчы Слуцкага, Мінскага і Навагрудскага паветаў, а яго насельніцтва ў 1865 г. налічвала 79 419 чалавек.

Тэрыторыю Мазыршчыны перасякала некалькі паштовых шляхоў: першага разраду — з Пецярбурга на Валынь праз Мазыр на Оўруч, станцыямі на ім былі Мазыр і Міхалкі. Другога разраду — з Мінска ў Мазыр праз Слуцк і Скрыгалаў, з Мінска праз Глуск на Скрыгалаў, ад вёскі Міхалкі на Кіеў праз Барбароў. У Мазыры на паштовай станцыі было 12 коней.

Дарога першага разраду, лепшая на Мазыршчыне, па апісанні этнографа П. М. Шпілеўскага, выглядала так:

«...От Екимовой Слободы на Валынь (158 верст) дорога носит название Валынского тракта. До Мозыря 84 $^3/_4$ версты, местность болотистая, лесная и малонаселенная, на которой разбросаны отдельные группы печальных невысоких холмов; по таким-то холмам, несколько возвышенным над общим уровнем страны, пролегает почтовая дорога, имеющая грунт песчаный, не счесть речек и безымянных ручьев, весной и осенью разливающихся и заливающих дорогу; значительная из этих речек называется Жердянкою, через которую устроено 4 моста, соединенных гатью... Вообще мостов здесь множество: самый длинный из них (40 сажень) построен через залив реки Припять, называемый Мерлявицей. Близ этого моста имеется три гати (длиною около 2 с половиной верст), ведущих к паромной переправе через реку Припять. При разливах реки гати затапливаются, и тогда переправа с одного берега на другой (на расстоянии 5—6 верст) идет чрезвычайно медленно (около 3-х часов и более), несмотря на то, что она производится двумя паромами... Дорога до крайности утомительна, а весною и осенью даже непроходима, по крайней мере для тяжестей...»

П. М. Шпілеўскі ў адзін з летніх вечароў 1858 г. пад'язджаў па гэтай дарозе да Мазыра. Ён палюбіў горад і пакінуў апісанне Мазыра сярэдзіны XIX ст.

Горад жыў складаным жыццём. Так, у канцы 50-х гадоў было вырашана пабудаваць замест старога драўлянага астрога новы. У 1859 г. падрадчык Х. Рубінштэйн атрымаў для гэтай мэты пазыку ў 8563 руб. 67 кап., але і ў 1865 г. нічога не было зроблена. Мост цераз Кіслякоўскі роў (раён Прымаставой плошчы), каштарыс на пабудову якога быў зацверджаны 20 кастрычніка 1858 г., Х. Рубінштэйн будаваў да мая 1863 г.

Сапраўднай бядой драўлянага Мазыра былі пажары. Пра адзін з іх, які здарыўся 11 мая 1856 г., упамінае П. М. Шпілеўскі ў нарысе аб Мазыры. На галоўнай вуліцы горада згарэла нават 12 слупоў з ліхтарамі з усіх 16.

У першай палове XIX ст. становішча беларускага сялянства было асабліва цяжкім. Краіна знаходзілася напярэдадні адмены прыгоннага права. У некаторых вёсках Мазырскага павета зімой усе мужчыны ішлі на лясны промысел, каб зарабіць грошай на падаткі ды купіць солі. Больш заможнымі сялянскімі дварамі ў параўнанні з панскімі былі аброчныя. У маёнтку Скароднае з 45 цяглавых двароў вылучаліся сяляне, якія разводзілі і прадавалі жывёлу. У іх было па 9—16 валоў, да сотні галоў буйной рагатай жывёлы (большасць маладняку) і не менш дробнай жывёлы.

У працэсе зараджэння і развіцця ў вёсцы капіталістычных адносін становішча сялян стала яшчэ цяжэйшым. Прычынай гэтаму была і вайна 1812 г., а таксама амаль дзесяць год неўраджаю ў пасляваенныя гады. У запісцы ад'ютанта Галоўнага штаба Першай рускай арміі гаварылася, што «...за пять лет после войны 1812 г., вследствие голода и угнетения население Мозырского уезда уменьшилось почти на третью часть». У шэрагу вёсак Мазырскага павета ў выніку голаду з-за неўраджаюназіраліся смяротныя выпадкі.

Сяляне маёнткаў Асавец, Рамязы, Махнавічы, Міхалкі, Барбароў, Слабада не раз скардзіліся па ўстановах на празмернае абцяжарванне паншчынай. Прыгонныя сяляне ў Рамязах падвяргаліся не толькі цяжкаму прыгнёту, але і нечуваным здзекам, асабліва з боку ўладальніцы маёнтка Стоцкай — «мазырскай Салтычыхі». У яе было абсталявана спецыяльнае памяшканне для катаванняў, дзе былі замучаны многія сяляне. «Салтычысе» дапамагаў у здзеках над людзьмі яе муж. Суд прыгаварыў Стоцкую да катаржнага астрога.

У вёсцы Прудок памешчык Іван Лянкевіч жорстка збіў селяніна Апанаса Падаляка за тое, што той з'явіўся на паншчыну з сахой, маючы адзін сашнік. Праз шэсць дзён Падаляк памёр. У 1843 г. мінскі губернатар звярнуўся да павятовых прадвадзіцеляў з патрабаваннем назіраць за адносінамі памешчыкаў да сялян, каб аслабіць прыгнёт і катаванні прыгонных — у губерні ўсё часцей адбываліся сялянскія хваляванні.

Вялікім бедствам для сялян былі рэкруцкія наборы ў армію: рэкрутаў пачалі браць і ў «Паўночна-Заходнім краі» (18 ліпеня 1840 г. выйшаў указ Мікалая I, які забараняў упамінанне назвы «Беларусь»). У 1847—1855 гг. бралі ў армію 7—10 чалавек з 1000 жыхароў на 25 гадоў службы.

У 1861 г., калі Аляксандр II падпісаў Маніфест аб адмене прыгоннага права, у Мазырскім павеце жыло 72 447 чалавек. Трэць іх — 20 473 чалавекі знаходзіліся ў прыгоннай залежнасці ў 112 памешчыкаў. Зямельная рэформа не апраўдала надзей сялян на справядлівае размеркаванне зямельных уладанняў, нярэдкімі сталі актыўныя выступленні іх супраць памешчыкаў і ўрада, як, напрыклад, у маёнтках памешчыкаў Кяневіча і Кавалеўскага. Улады асцерагаліся сялянскіх хваляванняў, на падаўленне іх пасылаліся воінскія часці. У Мазыры размясціўся 4-ты батальён Віцебскага пяхотнага палка. Сяляне не ўспрынялі царскую «міласць»: у Мазырскім павеце ў першы год пасля адмены прыгоннага права не была падпісана ні адна ўстаўная грамата.

У маёнтку Скрыгалаў, які належаў памешчыкам Снядзецкім, і пасля адмены прыгоннага права ў 1861 г. сяляне па-ранейшаму абавязаны былі адбываць паншчыну і іншыя павіннасці. Такое становішча выклікала незадаволенасць сялян, пачаліся хваляванні. Афіцэр корпуса жандараў даносіў 5 мая 1861 г. начальніку трэцяга аддзялення: «...Флигель-ад'ютант Кавелин распорядился о размещении роты Калужского пехотного полка в имении Скрыгалов помещика Снедецкого, сам выбыл туда же...»

У студзені 1863 г. пачалося паўстанне пад кіраўніцтвам Кастуся Каліноўскага. Яно ахапіла галоўным чынам заходнія раёны «Паўночна-Заходняга краю», у Мазырскім павеце было адносна спакойна. Тым не менш 14 лютага палкоўнік Рэйхарт у сваім данясенні шэфу жандараў князю Далгарукаву пісаў:

«По полученным сведениям оказывается, что революционный дух по Минской губернии распространяется и что враждебные происки ксендзов много к тому способствуют... Мозырский уезд... может быть вовлечен в мятеж, тем более что не имеется внутри их войск». У лютым у Мазыры быў раскватараваны 4-ты рэзервовы батальён і пяць рот пяхотнага палка на чале з палкоўнікам Чакмаровым. Палкоўнік Рэйхарт 20 лютага перадаваў, што «шайка мятежников разграбила 9 февраля следовавшие из Пинска параконную эстафету и почту... Узнав о преследовании их, направились поспешно в Мозырский уезд. В ограбленной почте находилось денег 4000 рублей и серии на 350 рублей, присланных из Пинского уездного казначейства в Минск... Губернатор по эстафете сообщил об этом факте командиру 4-го резервного батальона Витебского пехотного полка, расположенного в городе Мозыре, и просил принять распорядительные меры к пресечению дальнейшего следования злоумышленников».

У самым Мазыры хваляванне ахапіла гімназію. 15 лютага дырэктар яе Шульгін звярнуўся да палкоўніка Чакмарова з просьбай аб высылцы з горада выключаных з гімназіі вучняў, якія «несмотря на мое трехкратное отношение в Мозырскую полицию и к городничему о высылке из города, живут в городе и ожидают шайки мятежников, вышедшей из Пинска в Мозырь, бунтуют других учеников, угрозами и побоями заставляют их не ходить на уроки и подавать прошения об увольнениях, а потому имею честь покорнейше просить Ваше Высокоблагородие войти в это дело, исключенных заставить выехать из города, т. к. мне известно, что они заказали еврею ножи и четверть часа тому назад побили во второй раз уже в моей квартире окна». Настаўнік гімназіі ксёндз Выганоўскі ў мужыцкім кажусе, зверху якога была простая світка, быў затрыманы сялянамі Андрэем Пікузам, Паўлам Хмялеўскім і Агеем Пудзілам непадалёку ад мястэчка Скрыгалаў і дастаўлены да камандзіра батальёна ў Мазыры. Ксёндз заявіў, што не думаў ісці да паўстанцаў, а выйшаў з Мазыра таму, што дырэктар гімназіі сказаў, што ён будзе арыштаваны і перададзены суду за тое, што адмовіўся падпісаць акт аб вучнях, выключаных з гімназіі...

19 лютага мяшчане Аляксей Дубатоўка, Даніла Кучура і Леанід Трос прывялі да камандзіра батальёна сына мазырскага народнага засядацеля Бародзіча ў польскім нацыянальным адзенні. Дубатоўка заявіў, што Бародзіч прапанаваў яму дапамагчы вызваліць з астрога ксяндза, угаворваў ехаць у Бабруйск, дзе павінна была сабрацца шляхта, абяцаў даць грошай, пісталеты і стрэльбу, бо грошай у іх багата, ёсць зброя ў Кустаўніцы (вёска з каталіцкім насельніцтвам за 20 вёрст ад Мазыра, цяпер – тэрыторыя нафтаперапрацоўчага завода).

У звароце настаўнікаў гімназіі да папячыцеля Віленскай вучэбнай акругі 27 лютага гаварылася:

«...При нынешней верности и преданности здешних крестьян к государю императору и ненависти их к полякам никаких мятежнических шаек в здешнем крае не было бы, если бы иная была полиция; здешние чиновники – это первые изменники государю и отечеству. Когда совет учителей, после упорной борьбы с поляками-учителями, исключил взрослых и влиятельных учеников, на которых прочие смотрели как на представителей польского патриотизма, то вдруг ходатаями и заступниками их явились и предводитель дворянства Кеневич, и почетный смотритель Горват, и другие дворяне, а городничий на каждом шагу начал противодействовать гимназии... Еврей слесарь в совете учителей объявил, что 20 человек учеников заказали ему сделать для них длинные ножи, и городничий за то посадил еврея в острог... Когда пойманного крестьянами в лесу ксендза Выгоновского военное ведомство передало полиции, то полиция допустила, чтобы дамы и толпа жителей провожали Выгоновского со слезами, как мученика и героя патриотизма. Городничий ежедневно посылал ему чай и кушанья со своего стола и твердил вслед с докторами и польками, что ксендз Выгоновский сделал этот побег в приступе белой горячки. Некто Бородич старался подкупить мещанина Алексея Дубатовку поджечь острог, чтобы освободить ксендза Выгоновского. Дубатовка, связав Бородича, представил его батальонному командиру, а этот передал его полиции. Полиция же старается теперь объявить мещанина в том, в чем мещанин уличил Бородича... Словом, полиция всегда действует с поляками заодно. По городу разбросаны десятки печатных возмутительных книжек на простонародном языке... Паны притесняют крестьян, грабят и бьют по щекам русских священников...» Настаўнікі гімназіі прасілі прызначыць у Мазыры хаця б часова ваеннага начальніка з рускіх.

Пад час паўстання 1863–1864 гг. на Мазыршчыне не было ўзброеных сутыкненняў, не арганізоўваліся атрады, але частка мясцовага дваранства падтрымлівала паўстанцаў. Яшчэ ў снежні 1861 г. на сцяне Мазырскай гімназіі былі наклеены «возмутительные стихи»: «Позор вам, позор, польской земли дети!» Улады засцерагаліся, што настрой «пакрыўджанай» мазырскай шляхты можа перарасці ў адкрытыя выступленні, як гэта здарылася ў 1830–1831 гг., і прымалі меры па прадухіленні магчымых эксцэсаў. Памешчык Эміль Аскерка і яго сын Вітольд былі высланы з павета толькі за тое, што сталі ініцыятарамі падрыхтоўкі адраса да цара, які збіраліся падаваць «з найпакорлівейшай просьбай» аб далучэнні Мінскай губерні да Каралеўства Польскага. Некаторыя рэвалюцыйна настроеныя шляхціцы рыхтавалі зброю. Уладам удалося дыскрэдытаваць іх у вачах мясцовага сялянства распаўсюджваннем чутак, быццам «...паны бунтуют, не хотят давать крестьянам землю и волю». Сяляне, даверыўшыся гэтым пагалоскам, дапамагалі лавіць бунтаўшчыкоў... На Мазыршчыне ж амаль усе памешчыкі і больш заможныя сяляне былі польскага паходжання.

Паўстанне Кастуся Каліноўскага было жорстка падаўлена, баявыя дзеянні паўстанцаў на Мазыршчыне ўладам удалося паралізаваць. Усім жыхарам (акрамя сялян) забаранялася адлучацца далей 30 вёрст ад месца пражывання, насіць зброю. У «Минских губернских ведомостях» паведамлялася аб дваране Мазырскага павета Аляксандру Бандзкевічу, які за парушэнне гэтага загаду быў прысуджаны да «лишения дворянского достоинства и всех прав состояния...». Толькі ў 1868 г. у Мінскай губерні было адменена ваеннае становішча, уведзенае ў 1863 г. Аднак вайсковая каманда ў Мазыры засталася яшчэ на доўгія гады.

*А. Бобр, М. Сузько*

## СА СПРАВАЗДАЧЫ АКАНОМА МАЁНТКАЎ ПАМЕШЧЫКА МАЗЫРСКАГА ПАВЕТА КАЗІМІРА АСКІРКІ АБ ЯГО РУДНЯХ

1803 г. мая 10

| Какие заводы или фабрики | В каком именно месте | Кто хозяин, сам ли содержит или у кого на аренде | С какого времени существует |
|---|---|---|---|
| 1-я рудня железная | При дер. Идине | Содержат рудники крестьяне г-на Оскирки на аренде | с 1771 г. |
| 2-я рудня железная | в мест. Скрыгалове | 1802 г. содержали его рудники г-на Оскирки поданные на аренде. 1803 г. состоит при его владении | с 1702 г. |

*Белоруссия в эпоху феодализма. Т. 2.*

## Мазыр у 1812 годзе

Напярэдадні напалеонаўскага нашэсця ў Мазыры былі размешчаны часці рэзервовага корпуса на чале з генерал-лейтэнантам Ф. Ф. Эртэлем, які да 26 чэрвеня (6 ліпеня) 1812 г. называўся «рэзервовай арміяй». Войскі Эртэля былі размешчаны ў пяці губернях, а непасрэдна ў Мазыры напярэдадні вайны знаходзілася каля 9 тысяч салдат і афіцэраў. Мясцовае насельніцтва вельмі цярпела ад пастою войск. У той час казармы не будаваліся, вайскоўцы харчаваліся ад сялянскага ці мяшчанскага стала, толькі ў рэдкіх выпадках дапамагаючы ім па гаспадарцы. Тут, у Мазыры, знаходзілася таксама буйная правіянцкая база, якая фарміравалася з мясцовых рэсурсаў.

У пачатку вайны генерал П. І. Баграціён, камандуючы 2-й рускай арміяй, якая адступала ўглыб краіны, на падыходзе да Бабруйска накіраваў у Мазыр абоз з параненымі. Французы меркавалі, што і сам Баграціён рушыць сюды, але армія пасля кароткага прыпынку ў Бабруйскай крэпасці пайшла на Магілёў. Баграціён прызначыў каменданта Бабруйскай крэпасці генерала Г. А. Ігнацьева ваенным губернатарам неакупіраванай часткі Мінскай губерні (грамадзянскі губернатар П. М. Добрынскі кватараваў у той час у Мазыры). Тэрыторыя паміж Мазыром і Бабруйскам кантралявалася коннымі раз’ездамі з крэпасці.

Стратэгічную важнасць Бабруйскай крэпасці добра разумеў Напалеон, для яе ўзяцця ён вылучыў 15-тысячную групу на чале з генералам Я. Дамброўскім. У пачатку жніўня Бабруйск аказаўся ў асадзе. Войскі Эртэля выйшлі з Мазыра і, прайшоўшы лясамі па цячэнні рэчкі Пціч, 2(14) верасня былі ў Глуску. Ля вёскі Гарбацэвічы адбылася бітва, у якой поспех спадарожнічаў Эртэлю. Аднак, не ведаючы дакладна колькасці падыходзячых да непрыяцеля падмацаванняў, ён вярнуўся ў Мазыр. У Бабруйскую крэпасць па загаду М. І. Кутузава Эртэль накіраваў падмацаванне.

Восенню, калі расійская армія паспяхова вяла контрнаступленне, пачалося вызваленне паўднёва-ўсходняй Беларусі. На корпус Эртэля была ўскладзена задача разбіць дывізію Дамброўскага і зняць аблогу Бабруйскай крэпасці. Аднак Эртэль не выканаў загаду Кутузава, спаслаўшыся на цяжкасці пераправы цераз Прыпяць, якая пакрылася лёдам (у тым годзе былі раннія маразы). Атрымаўшы новы загад выступіць у напрамку Мінска, ён дакладваў аб немагчымасці ісці туды, бо па дарозе не было мастоў, а ў Мазыры давялося б пакінуць вялікую колькасць правіянту і дзве тысячы хворых. Толькі ў пачатку лістапада корпус выступіў да Ігумена. (Пасля Эртэль быў прызначаны ваенным генерал-паліцмайстарам дзеючай арміі. «Праходзячы службу ў паса-

дах паліцэйскіх і ў іх дасягнуўшы чына генерал-лейтэнанта і іншых узнагарод, — пісаў аб ім А. П. Ярмолаў, — ён практыкаваў паліцэйскія свае здольнасці ў прыпісцы жыхароў у ваколіцах Мазыра».)

Айчынная вайна 1812 г. закранула такім чынам і Мазыршчыну. Сотні жыхароў яе неслі ратную службу ў расійскім войску, некаторыя з іх дайшлі да Парыжа. Тысячы сялян прыцягваліся да перавозу харчоў і фуражу, выканання іншых павіннасцей ваеннага часу.

*В. Лютынскі*

**ВЫПІСКА З ІНВЕНТАРУ МАЁНТКА СКРЫГАЛАЎ МАЗЫРСКАГА ПАВЕТА ЗА 1848 г., ПАМЕШЧЫЦЫ СНЯДЗЕЦКАЙ**

§ 1

В имении этом заключается:
Фольварки: Скригалово и Лешня, местечко Скригалово.
Деревни: Скригалово, Лешня, Рудня, Казимировка.

§ 2

По инвентарю, представленному помещиком, показано крестьян: по 8-й ревизии, мужеского пола 541, женского 566, а на лицо мужеских 531, женских 561.

В том числе рабочих: мужеских 312, женских 326; хозяев: тяглых 115... огородников 36, бобылей 8, дворовых людей: мужеских 21, женских 12...

§ 3

Из общего пространства в имении земли, заключающагося в 14 359 $^{1}/_{2}$ десятинах, находится у крестьян мирской земли, именно: усадебной и огородной 123 д. 1300 в., пахотной 1857 д. 800 в., сенокосной 464 д. ...

§ 4

Кроме сего крестьяне пользуются: господским лесом для постройки и починки домов своих и хозяйственных строений и снарядов, пастбищными местами на парных полях, выгонах и в лесах, а также пчеловодством, сбором лесных плодов, ловлею рыбы в указанных местах и ссудами за отработки.

§ 5

Как первоначальный инвентарь в отношении повинностей и работ крестьян, владельцу был дан только временно, а потому прилагается при сем, для точного и буквального исполнения, печатный экземпляр Высочайше изданных Правил, которая, по введении их в действие, имеют полную силу закона в имении.

Подлинную подписал:

Виленский Военный Губернатор,
Гродненский, Минский и Ковенский
Генерал-Губернатор

Генерал-адъютант Бибиков

## «Как хорош, красив город!»

**Шпілеўскі Павел Міхайлавіч** нарадзіўся 31.10.(12.11)1823 г. у в. Шыпілавічы Бабруйскага павета, беларускі этнограф, пісьменнік, публіцыст і крытык. З сям'і святара. Скончыў Мінскую духоўную семінарыю і Пецярбургскую духоўную акадэмію. Настаўнічаў у Варшаве. З 1853 г. — у Пецярбургу. Многа падарожнічаў па Беларусі і збіраў фальклорна-этнаграфічныя матэрыялы.

У 1853 г. накіраваўся ў працяглую камандзіроўку, за тры гады аб'ехаў чатыры беларускія губерні, надрукаваў свае ўражанні пад назвай «Падарожжа па Палессі і Беларускім краі». Праца

складалася з некалькі кніг, адна з іх — «Мазыршчына», надрукаваная ў 1853—1855 гг. Аўтар сабраў цікавыя звесткі з гісторыі гарадоў, мястэчак і вёсак Беларусі, апісанні побыту, павер'яў, абрадаў і звычаяў народа, з павагай гаворыць пра сумленнасць і працавітасць беларускага селяніна, падкрэслівае самабытнасць беларускай мовы.

Памёр П. М. Шпілеўскі ў 1861 г.

Ніжэй прыводзіцца ўрывак з кнігі «Мазыршчына».

...Я подъезжал к Мозырю с речицкого тракта и должен был переправляться через судоходную, извилистую реку Припять, которая длинною, широкою пеленою расстилается у самого подножья города. В ожидании парома любовался на Мозырь в виду пристани, у которой слегка покачивались разные оснащенные судна, известные под именем берлинок, в том числе небольшой красивый пароход — явление редкое в отдаленном глухом уезде России.

Был поздний летний вечер. В быстрых, волнистых струях Припяти отражались бесчисленные огни домов, раскинувшихся на отлогих берегах гор, из-за вершины которых виднелись блестящие купола и железные кресты церквей, дальше — долина, и опять горы, опять здания, опять домики и снова — огоньки. И так весь город, который как бы уходит от стремительных приливов норовистой реки, расползаясь то в долинах, то на крутизнах и хребтах пригорков. Крутизны, хребты пригорков окаймлены то густыми кустарниками диких деревьев, то красиво устроенными садами с полновесными грушами и сливами, которыми славится Мозырь... Через полчаса я уже взбирался на бесконечные крутизны, а потом с мозырских гор еще раз взглянул на оставшуюся внизу Припять. Как хорош, красив город! Немного таких уголков в России...

В настоящее время, несмотря на частые пожары, и особенно сильный недавний пожар, который уничтожил чуть ли не большую часть зданий, Мозырь принадлежит к числу самых красивых и чистых городов западно-русского края. Постоянных жителей в нем, по последним статистическим данным, 4700 душ, но как портовый город он имеет множество временных поселенцев, особенно летом, когда пристань его на протяжении полуверсты уставлена различного рода большими и малыми судами, по преимуществу прусскими и познанскими берлинками. В это время Мозырь оживляется и представляет из себя смесь племен и наречий; к тому же летом бывают две ярмарки, из которых одна, Спасская, начинается с 6 августа и, продолжающаяся около трех недель, интересна своей разнообразной торговлей.

На Спасскую ярмарку съезжается дворянство и купечество из соседних уездов и из других губерний. Прусские и познанские купцы скупают лен, пеньку, сало, овечью и свиную шерсть, копченую рыбу, рыбий жир и кожи. Мозырские хозяева (больше мещане) и некоторые помещики с успехом сбывают означенные товары, особенно раскупаются кожи и рыбий жир. Некоторые продают этого товару на большие суммы: мозырские кожи отличаются прочной выделкой, секрет которой местные промышленники скрывают от всех, говорят, они употребляют какой-то сок лесных растений. Во время ярмарки в городе устраивается на главной площади целая колония дощатых лавок и балаганов, в которых можно увидеть разные привозные редкости, заграничные и туземные; последние присылаются из Варшавы, Вильно, Киева и Минска...

К чести мозырского образованного общества нужно сказать, что книги раскупаются охотно; кроме книг некоторые мозыряне выписывают журналы и следят за современностью. Мне не раз приходилось бывать в обществе таких людей, которые занимаются науками и искусствами, разрабатывают материалы для истории западно-русского края, с увлечением предаются исследованиям местных древностей и открытий из области естественных наук. С удовольствием могу указать на образованного ученого, любителя древностей помещика г. Франковского, собирающего редкие славянские монеты и сделавшего большие успехи в изучении мозырских курганов и разных других насыпей. Этот достойный ученый доставил мне возможность познакомиться с актами и грамотами городской ратуши, магистрата, от него узнал о замечательном таланте местного поэта г. Неслуховского, описавшего похождения некоторых мозырских героев времен татарских набегов в звучных, легких стихах. Особенно хороша его поэма, названная по имени реки Припять — «Припеинада». В этой поэме, состоящей из 50 страниц, поэт в прекрасных стихах рассказывает о геройстве Сайкера, татарского вождя, бросившего татарский лагерь и перешедшего на сторону мозырского ополчения, живописно рисует местность красивого хутора Ипогара, бой казаков на вершинах мозырских гор и любовь Сайкера к одной красивой мозырянке. Поэма наполнена описаниями нравов мозырян, гостеприимства их, также разных местных преданий и поверий.

...Мужчины ходят в длинных сапогах и войлочных бурых шляпах с широкими полями, зимой шляпы заменяются меховыми шапками в роде древних боярских. Сюртук из бурого домашнего сукна с длинными полами и частыми складками у талии, у ворота и обшлагов обшивается синими или другими цветными шнурками; зимой носят меховые (волчьи и медвежьи) широкие шубы с талиями. Женщины — непременно в башмаках, чаще с подковками, а по праздникам — с красными подборами и металлическими пряжками, головы покрывают — старухи наметками (длинное узкое покрывало из белого полотна, нередко самого тонкого, с ажурными тканями на концах; покрывалом этим несколько раз обвивают голову, по сторонам висят концы), лямцами (нечто вроде кокошника в виде четырехугольника на лбу, с накинутым

полотенцем, концы которого спускаются назад) и цветными платками, обыкновенно повязанные вроде татарской чалмы. Молодицы и вообще девицы носят белые платки, из-под которых выпускаются две косы с цветными, выплетенными на концах лентами.

Некоторые мещанки щеголяют в городских платьях и не покрывают (летом) головы, но это щеголихи-мещанки, которые, к сожалению, увлекаются панскими нарядами и представляют из себя ворон в павлиньих перьях. Обыкновенно же они ходят в суконных довольно грациозных жупянках (род пальто ниже колен, с талией в обтяжку).

Еще грациознее их корсеты, большей частью из ярких шелковых, шерстяных, суконных, ситцевых и нередко бархатных материй; в этих корсетах, с многочисленными блестящими пуговицами впереди и назади, с разрезными баскинами ниже талии, без рукавов, красиво обрисовывается их стройный стан. Из-под корсета открываются большие слоеные или просто складчатые воротники белой рубашки, рукава которой заканчиваются у кисти руки чем-то вроде манжет и буфов, перетянутых широкой лентой и пристегнутых большими запонками. Поверх воротника надевается множество ниток янтарных бус, гранат, коралл и стекляруса с серебряными монетами: все это наследие бабушек и прабабушек, переходящее из семьи в семью, которого не продают даже в самой крайней бедности.

Дополнением корсета служит андарак (верхняя юбка, оторачиваемая внизу бахромой). Андараки бывают не закрывающие ног, они делаются больше из шерстяных тканей домашнего приготовления, окрашиваемые замечательно прочной краской, известной под именем червеца. Червец этот добывается из каких-то полевых и лесных цветов и дает превосходную чистую ярко-красную краску, никогда не теряющую своего вида до износа андарака. Многие приезжие иностранные промышленники старались подметить тайну окрашивания червецом и потом делали у себя опыты, но мозырская краска гораздо чище и ярче. Для приготовления ее кладут какой-то речной камень, растворяющийся в горячей воде, но этого-то камня не называют и его нелегко достать.

Во время ярмарки для приезжего дворянства и местных горожан устраивается временный театр, имеющий, впрочем, постоянное помещение в нарочно приготовленном здании; здание небольшое, но не лишено некоторой изящности во внутренней отделке. Приезжая минская губернская труппа обеспечена жалованьем и пользуется летними каникулярными отпусками. В составе этой труппы есть несколько образованных артистов и артисток, между которыми обращает внимание своей натуральной игрою и приятным звучным голосом молодая девица Дроздовская, собирающаяся дебютировать даже на столичной сцене. Но главным развлечением бывают ресурсы, т. е. благородные танцевальные собрания, к которым наперед заблаговременно приготовляются мозырские дамы, любящие наряжаться.

В Мозыре можно насчитать более сотни всяких лавок, особенно железных, в которых немало изделий, приготовляемых из мозырской железной руды. В грунтах мозырских горных ущелий водится железная руда, обрабатываемая в местных рудокопнях: лучшие железные руды вдоль берегов реки Славечны.

...Мозырь больше застроен деревянными зданиями довольно правильной и красивой архитектуры во вкусе русском и с примесью частично и византийских элементов, которые преимущественно отражаются на фронтовых портиках и фасадах крыш, изузоренных доморощенной резьбой и насечками: красивый вид зданий поддерживается просторными дворами и большими садами. Сады эти тем интереснее, что они раскинуты на пригорках, которыми изрезан гористый Мозырь.

Нельзя, однако, сказать, что в Мозыре нет каменных домов — есть несколько, и даже довольно большого размера. Самое видное место занимает Бернардинский монастырь, расположенный на большой горе, основанный в 1654 году, но в последнее время, с уничтожением ордена Бернардинов, окончательно упраздненный и представляющий развалины. Католическое богослужение совершается в деревянном костеле — фаре, основанном польским королем Сигизмундом III в 1616 году, по ходатайству мозырского старосты Балтазара Стравинского. Православных церквей две — соборная, на высоком крутом кургане, к которому ведет длинная лестница с целой сотней ступеней, и приходская — Пятницкая. Обе церкви деревянные; по стилю наружной постройки и внутренних украшений, икон и куполов носят на себе отпечаток старины, если не глубокой древности.

Памятником литовской старины могут служить общественные городские весы, выставленные на Замковой площади, к которым должны были прибегать в случае обвеса все покупатели; на этих весах положено было взвешивать все сборы и пошлины как с местных, так и с приезжих купцов. Эти весы под именем литовских существуют и теперь на рыночной площади, но без всякого употребления, они наглухо вколочены в землю. Нельзя не обратить внимание, что польские короли во время владычества в западно-русском крае искореняли все русское и литовское, но не уничтожили весов литовских. По крайней мере, мозырские весы сохранились с незапамятных времен, о них говорится еще в 1572 году в грамоте Августа II.

Там же имеются и другие древние грамоты. Я имел случай просматривать грамоты от 1572 года (о городских порядках, о мостах и судах в замке), 1577 года (о городских сборах и пошлине — мыте пива), 1670 года (об утверждении Магдебургского права), 1680 года (о торгах и сборе за ловлю рыбы), 1685 года (о торгах по пятницам). Во всех этих грамотах упоминается о собственности (о Грунтах) городских мещан на пространстве от речки Лубни вверх Припяти до притока Окаризы...

## Мазыранін — актыўны паўстанец 1863 года

Праведзеная царскім урадам рэформа 1861 г. яшчэ больш пагоршыла становішча беларускіх сялян. У адказ на грабежніцкую рэформу паўсюдна пачаліся сялянскія хваляванні, у студзені 1863 г. яны перараслі ў рэвалюцыйнае нацыянальна-вызваленчае паўстанне, якое ахапіла Беларусь, Польшчу, Літву і Украіну.

Барацьбу беларускіх сялян супраць памешчыкаў узначалілі рэвалюцыянеры-дэмакраты на чале з выдатным сынам беларускага народа Кастусём Каліноўскім. У кіраўніцтве паўстаннем разам з такімі гістарычнымі асобамі, як Валерый Урублеўскі, Яраслаў Дамброўскі і іншымі прымаў удзел і выхадзец з Мазыршчыны паляк Іеранім Феліксавіч Кяневіч. Жыццё яго, напоўненае рамантыкай барацьбы, абарвалася ў 30 гадоў.

Да 23 гадоў ён жыў у Францыі, куды вымушаны былі эмігрыраваць яго бацькі — удзельнікі паўстання ў Польшчы 1830—1831 гг. У 14 гадоў Іеранім атрымаў баявое хрышчэнне на барыкадах Парыжа. Бацькі Кяневіча пасля Крымскай вайны па амністыі вярнуліся на Палессе. Сын к гэтаму часу атрымаў дыплом інжынера-будаўніка і накіроўваўся ў Пецярбург для работы ў Галоўным упраўленні расійскай чыгункі. Ёсць пэўная падстава меркаваць, што туды яго прыцягвала не работа, а перш за ўсё імкненне быць у цэнтры рэвалюцыйнага руху. У Пецярбургу ён неўзабаве стаў удзельнікам падпольных гурткоў рэвалюцыйнай моладзі.

З 1859 па 1863 год Кяневіч у Маскве, куды быў накіраваны як прадстаўнік рэвалюцыйнай арганізацыі польскай моладзі для падтрымання сувязей з маскоўскай арганізацыяй «Зямля і воля». У гэтыя ж гады ён неаднаразова наведваў Мазыр, дзе знаходзіўся яго дом (цяпер адзін з карпусоў санаторна-лясной школы), а недалёка жылі бацькі. Паездкі ён выкарыстоўваў і для асабістых кантактаў з Каліноўскім, з якім быў добра знаёмы, з іншымі рэвалюцыянерамі-дэмакратамі.

З пачаткам паўстання 1863 г. на Кяневіча была ўскладзена задача — падтрымліваць сувязі з рэвалюцыйнай арганізацыяй «Зямля і воля», узначаліць паўстанне ў цэнтры Расіі, дзе галоўная стаўка рабілася на Казань. Акрамя гэтага, ён дапамагаў паўстанню асабістымі сродкамі. Спроба паўстання ў Казані пацярпела паражэнне, як і паўстанне ў Польшчы, Беларусі і Літве. Атрады паўстанцаў былі разбіты, многія кіраўнікі арыштаваны і асуджаны да пакарання смерцю. Іеранім Кяневіч быў арыштаваны на граніцы і дастаўлены ў Казань, дзе пасля доўгіх допытаў і катаванняў 6 чэрвеня 1864 года таксама пакараны смерцю.

Царскія каты, адчуваючы, што Кяневіч многа ведае аб рэвалюцыйнай арганізацыі «Зямля і воля», спрабавалі пагрозамі, шантажом атрымаць у яго звесткі аб гэтай арганізацыі. Але ён праявіў непахісную цвёрдасць характару, ні слова не сказаў аб землявольцах і тым самым выратаваў увесь цэнтр рускай рэвалюцыйнай арганізацыі.

*М. Капач*

## Царкоўны звон над Мазыршчынай

З канца XVI ст. абвастрылася барацьба двух асноўных напрамкаў хрысціянства: праваслаўя і каталіцызму.

У XVI ст. у Мазырскім павеце былі два царкоўныя прыходы — Спаскі і Міхайлаўскі. Памешчыкі Аскеркі, тады яшчэ праваслаўныя, абаранялі адзінаверцаў ад каталіцкага духавенства, з іх дапамогай гараджане вялі паспяховую барацьбу супраць базіліянскіх манахаў, якія спрабавалі асесці ў горадзе. Аднак асабліва актыўна каталіцызм пачаў пранікаць на Мазыршчыну пасля таго, як у 1615 г. Сігізмунд III выдаў фундуш для першага касцёла ў горадзе. Ён быў пабудаваны намаганнямі Балтазара Стравінскага ў 1616 г.

У 1645 г. мазырскі палкоўнік Стэфан Лозка запрасіў у горад бернардзінскіх манахаў, для якіх быў пабудаваны касцёл і манастыр (кляштар). Касцёл на Спаскай гары атрымаў назву св. Міхаіла. (Гэтыя драўляныя пабудовы знішчаны ў час войнаў сярэдзіны і другой паловы XVII ст. Касцёл быў адноўлены мазырскім маршалкам Рафалам Аскеркам у сярэдзіне XVIII ст.)

14 сакавіка 1647 г. мазырскі староста Караль Іеранім Хадкевіч адпусціў зямлю пад каталіцкі манастыр на Гурыноўскім пляцы. Тут пазней быў пабудаваны жаночы манастыр ордэна св. Марыі (цяпер мэблевая фабрыка па вул. Гогаля). Багатыя землеўладальнікі-католікі пры жыцці ці ў завяшчаннях рабілі манастырам багатыя падарункі або куплялі сабе на манастырскай зямлі месца для ўласных усыпальніц. Па духоўным завяшчанні Юрыя Ярашэвіча 12 студзеня 1666 г. ахвяраваліся пяцьсот злотых на малітву і пляц у адным з мазырскіх манастыроў. Такія ж ахвяраванні паступілі 6 чэрвеня 1673 г. ад Анастасіі Ельскай, 10 ліпеня 1677 г. — ад мазырскага бургамістра Фёдара Сялковіча. За кожны пляц манахі бралі чынш — 2 рублі срэбрам.

У XVII – XVIII стст. у Мазыры знаходзілі прытулак манахі розных каталіцкіх ордэнаў, спадзеючыся перанесці сваю веру на мясцовае насельніцтва, якое ў большасці заставалася праваслаўным.

У 1673—1674 гг. недалёка ад Мазыра, у мястэчку Юравічы, дзякуючы намаганням Марціна Тураўскага заснавалася езуіцкая місія. У 17—30-х гг. XVII ст. езуіцкі касцёл быў пабудаваны ў Мазыры. У пачатку XVIII ст. тут адкрыліся мужчынскі і жаночы бернардзінскія манастыры. У гэты ж час у Мазыры ўсталяваліся баземанe на чале з Тадэвушам Янкевічам. З імі доўга змагаўся ландвоіт Апока, яго падтрымлівалі Аскеркі. У 1747 г. пратапоп мазырскі Фёдар Савіцкі паведамляў слуцкаму архімандрыту, што з



Міхайлаўскі сабор XVIII ст.

50 цэркваў яго прыхода засталося толькі 7, астатнія «отняты на унию». У раёне Ангельскай (Цёмнай) даліны і ўрочышча Самбор згодна фундушу навагрудскага кастэляна Годземы Яленскага і дзякуючы намаганням ксяндза Бенядзікта Ражанскага ў 1745 г. быў адкрыты адзіны ў Літве манастыр жаночага каталіцкага ордэна марнавітак. У 1787 г. каля Мазыра быў пабудаваны францысканскі манастыр.

27 сакавіка 1793 г. быў апублікаваны загад аб далучэнні былых польскіх абласцей да Расіі, у тым ліку і Мазырскага павета. З красавіка 1794 г. у Мазырскую акругу быў прызначаны дабрачынны Пётр Міткевіч. У маі гэтага ж года большасць прыходаў была аб'яднана з праваслаўнай царквою (Барбароў, Міхалкі, Скрыгалаўская Слабада, Сідзельнікі, Скрыгалаў, Мялешкавічы). Да 16 чэрвеня 1795 г. было аб'яднана 13 прыходаў. 4 жніўня адбылося ўрачыстае адкрыццё Мінскай губерні.

У пачатку 30-х гадоў XIX ст., пасля паўстання 1830—1831 гг., пачалося закрыццё каталіцкіх манастыроў і касцёлаў. У 1831 г. у Мазыры быў закрыты бернардзінскі касцёл, праз некалькі гадоў — Сухавіцкі базіліянскі манастыр, вядомы з 1620 г. 12 лютага 1839 г. была адменена Унія, а ў 1841 г. улады забралі зямлю ў каталіцкага духавенства. Не стала ў католікаў і Міхайлаў-

скага касцёла. Даўжэй дзейнічаў жаночы манастыр цыстэрсак на Кімбараўцы. У 1864 г. яго закрылі, а продаж будынка манастыра быў прызначаны толькі на 4 снежня 1881 г., але не з'явіліся купцы. У манастыра было 290 дзесяцін зямлі, часткай якой карыстаўся нехта Бяляеў. На імя імператара Аляксандра III 28 лютага 1882 г. мазырскімі дваранамі Лянкевічамі і іншымі было паслана прашэнне пакінуць касцёл і манастыр. З такім прашэннем звярнулася ў міністэрства ўнутраных спраў і настаяцельніца манастыра Аляксандра Пацэвіч. Просьбы засталіся без адказу. 11 кастрычніка 1886 г. манастыр быў закрыты.

У сярэдзіне XIX ст. у Мазыры існавала Міхайлаўская праваслаўная саборная драўляная царква. Прыход яе — 959 чалавек мужчынскага і 939 жаночага полу, ворыва і сенажацей – да 400 дзесяцін. Да яе з 1841 г. адносіліся былы бернардзінскі цагляны касцёл, Лазараўская могільная царква, Мікалаеўская драўляная, а таксама пабудаваная ў 1837 г. Сідзельніцкая царква. Да Параскіеўскай царквы была прыпісана ў канцы XIX ст. царква Ражаства-Багародзіцы, Барыскавіцкая і Пеніцкая. У яе прыходзе знаходзілася частка Мазыра, 7 вёсак, 4 хутары. Прыхаджан налічвалася 1504 мужчыны і 1590 жанчын, зямлі — 232 дзесяціны.

Свята-Троіцкая царква на Кімбараўцы, перабудаваная з каменнага касцёла ў 1894 г., мела ў прыходзе 6 пасяленняў, каля 1200 прыхаджан, царкоўнай зямлі — 70 дзесяцін. Да яе была прыпісана царква і ў вёсцы Гурыны.

У 1832 г. быў ліквідаваны манастыр бернардзінцаў, да таго ж у 1839 годзе ён згарэў, і быў складзены каштарыс на перабудову касцёла ў праваслаўную царкву. Ахвяраванні на яе ўзвядзенне ўнеслі грамадзяне Мазыра — Пратасава, Сухоцін, Ляпін, маскоўская княгіня Даўгарукава, граф М. І. Мураўёў. Падрадчыкам быў мінскі купец А. А. Свечнікаў, які падараваў 5 ікон — копій з арыгіналаў Мінскага кафедральнага сабора. Маскоўскі святшчэннаслужыцель С. Д. Цвяткоў садзейнічаў у набыцці царкоўнага посуду і званоў (адзін звон важыў 60 пудоў). Перабудова касцёла абышлася ў 14 300 рублёў. 5 верасня 1865 г. новы сабор быў асвечаны ў імя св. Архістраціга Міхаіла. На ўрачыстасцях спяваў хор мазырскай гімназіі, снеданне даваў мазырскі галава І. К. Сайкоўскі. Навучэнцы гімназіі ахвяравалі сабору ікону Аляксандра Неўскага. Але асаблівую павагу мела ікона Багамацеры, якую выратавалі ў час пажару з Ражаства-Багародзіцкай царквы ў 1839 г. Захавалася ў саборы Евангелле Львоўскае 1601 г. і Кіеўскае 1773 г. Сабор св. Міхаіла дзейнічае і цяпер.

Да прыходу Мазырскага сабора належалі абывацелі горада, што жылі на Пакроўскай і Кіеўскай вуліцах да Базарнай плошчы і мяшчане хутароў Казенкі, Бабры, Раеўскія, Матрункі, Бабраняты, Булаўкі, Салаўёўка, а таксама вёсак Бібікі, Гурыны, Акулінка — усяго мужчынскага полу 1381, жаночага — 1432 чалавекі. Сабору належала прыходскае вучылішча ў Мазыры і царкоўнае ў Гурынах (будынак вучылішча і царкву пабудаваў у вёсцы памешчык Абуховіч). Свяшчэннікам з 1861 па 1876 г. быў кандыдат багаслоўя Георгій Тарнапольскі, дыяканам служыў Георгій Пігулеўскі. Сабору належалі 400 дзесяцін ворыва.

У Мазыры да сённяшняга дня захаваліся рэшткі муру Базіліянскага манастыра, які быў размешчаны на сучаснай Яснай Гары.

Бернардзінскі манастыр, які быў заснаваны ў 1645 г., — цяпер Міхайлаўскі сабор. У ім захаваліся манастырскія келлі, у склепе пакояцца целы нябожчыкаў. Патаемны ход адсюль цягнуўся да памесця Кімбараўка, дзе былі два жаночыя манастыры — ордэна цыстэрсак і ордэна марнавітак. Першы належыць цяпер спартыўнай базе таварыства «Дынама» і каталіцкай суполцы горада, у пабудовах другога знаходзіліся вытворчыя памяшканні запалкавай

фабрыкі «Маланка», цяпер — мэблевая фабрыка. Да старых будынкаў можна аднесці сінагогу, якой налічваецца больш за 200 год...

*А. Бобр, М. Сузько*

### Кляштар бернардзінцаў

Вул. Камсамольская, 16. Пабудаваны ў 1-й палове XVIII ст. з цэглы. Кляштар складаецца з касцёла і прыбудаванага да яго з усходняга боку жылога корпуса.

Касцёл трохнефавы, двухвежавы. Галоўны фасад раскрапаваны пілястрамі і карнізамі. Уваход аформлены кілепадобным парталам з крывалінейным франтонам. Бакавыя фасады вылучаны рытмам кілепадобных аконных праёмаў і здвоеных пілястраў у прасценках. Вежы касцёла спачатку барочнага характару перабудаваны ў стылі класіцызму: трохвугольныя франтончыкі, арачныя праёмы ў прамавугольных нішах.

Прастора інтэр'ера падзелена 4 слупамі на 3 нефы. Цэнтральны неф перакрыты цыліндрычным скляпеннем на падпружных арках, бакавыя — крыжовымі скляпеннямі. Пяцігранная алтарная частка аддзелена іканастасам. Хоры размешчаны над уваходам. Пад алтарнай часткай знаходзіцца крыпта. Жылы корпус характэрнай галерэйнай планіроўкі: келлі маюць выхад у калідор, асветлены аконнымі праёмамі.

У тарцовай частцы вялікая квадратная ў плане трапезная, перакрытая цыліндрычным скляпеннем з распалубкамі.

Кляштар — помнік архітэктуры барока.

*А. Кулагін*

### Кляштар цыстэрцыянцаў

Вул. Гогаля, 121. Пабудаваны ў 1745 г. Уключае мураваны касцёл і жылы корпус. Цяпер у жылым корпусе размешчана спартыўная база. Касцёл аднанефавы з трохграннай алтарнай часткай і высокім двухсхільным дахам. Галоўны фасад трохчасткавы, насычаны вертыкальнай крапоўкай, прарэзаны арачнымі аконнымі праёмамі, нішамі з ракавінамі і завершаны атыкавым ступенчатым шчытом. Гарызантальныя чляненні фасада падкрэслены крапаванымі карнізамі. Галоўны ўваход — праз нізкі пяцігранны тамбур, дэкарыраваны лапаткамі. Прастора інтэр'ера рэканструявана (падзелена на 2 паверхі). Прэсбітэрый вылучаны арачным праёмам, сцены крапаваны шматслойнымі карнізамі, пілястрамі, нішамі.

Жылы корпус двухпавярховы, прамавугольны ў плане. Фасады крапаваны пілястрамі. Планіроўка галерэйная з аднабаковым размяшчэннем тыпавых келляў.

Кляштар — помнік архітэктуры позняга барока.

*А. Кулагін*

## Напярэдадні буры

На пачатак 1878 г. насельніцтва Мазыра налічвала 7800 чалавек. Тут было 25 мураваных і 1082 драўляныя дамы, мелася друкарня і метэаралагічная станцыя. Два разы ў год праводзіліся кірмашы: 6 студзеня і 6 жніўня, на якіх гандлявалі ў асноўным лесам, жывёлай, збожжам, рыбай, смалой, дзёгцем, паташом, шкіпінарам і інш. Гандлёвы абарот кірмашоў складаў каля 300 тыс. рублёў. З гэтай сумы дзве трэці прыходзілася на ўвоз, адна трэць — на вываз тавараў.

У 70—80-я гады XIX ст. у Мазыры не было буйных прамысловых прадпрыемстваў, развіваліся рамесная вытворчасць і гандаль. У невялікай гарбарнай майстэрні, піваварні, на вытворчасці алею колькасць работнікаў дасягала крыху больш як 100. Прыстань пасажырскіх параходаў абслугоўвала рэйсы паміж Кіевам і Пінскам.

Яшчэ ў сярэдзіне 70-х гадоў экспедыцыя генерала І. І. Жылінскага паклала пачатак навуковым даследаванням і спробам асушэння балот беларускага Палесся. Беднасць сродкаў, якія выдзяляў урад на гэтыя мэты, не дазволіла здзейсніць намечаную праграму.

Жыхары горада і павета актыўна адгукваліся на ўсе значныя падзеі, якія адбываліся ў свеце.